 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-34-40

УДК 94(476)"1795/1914":687.1

# АДЗЕННЕ БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯНАК КАНЦА XIX — ПАЧАТКУ XX ст. У МУЗЕЙНЫМ ЗБОРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛАЦКАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА

*Бараненка Таццяна Валер’еўна,*
*магістр гістарычных навук,*
*вядучы навуковы супрацоўнік Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я — філіяла НПГКМЗ*

*Артыкул прысвечаны комплексу адзення беларускіх сялянак канца XIX — пачатку XX ст., што захоўваецца ў музейным зборы Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей — НПГКМЗ). Аўтарам упершыню даецца навуковая характарыстыка і сістэматызацыя адзення беларускіх сялянак канца XIX — пачатку XX ст. са збору НПГКМЗ. Звяртаецца ўвага на цяжкасці ў фарміраванні калекцыі і прапануюцца шляхі іх пераадолення.*

***Ключавыя словы**: адзенне, беларускія сялянкі, традыцыйная культура, Расійская імперыя, музейная калекцыя.*

Сярод матэрыяльных форм традыцыйнай народнай культуры беларусаў адно з галоўных месцаў займае рамяство вырабу адзення. Беларускае народнае адзенне фарміравалася на працягу не адной сотні гадоў, убіраючы ў сябе лепшыя элементы тэхналагічнага і мастацка-стылістычнага вопыту папярэдніх пакаленняў. Найбольш яскрава гэты вопыт мы зараз можам пабачыць на прыкладах традыцыйнага беларускага жаночага адзення канца XIX я — пачатку XX ст., якое захоўваецца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (НПГКМЗ).

Фонды музея-запаведніка уключаюць дастаткова вялікую калекцыю «Адзенне» (на 01.04.2021 г. яна налічвае 1136 адзінак захоўвання, храналагічныя рамкі калекцыі — XIX—XXI стст.). Сярод разнастайнага адзення, галаўных убораў, абутку, аксесуараў на сённяшні момант уяўляецца актуальным і мэтазгодным разгледзець у рамках агульнай калекцыі беларускае жаночае адзенне канца XIX — пачатку XX ст., характарыстыка якога доўгі час была павярхоўнай, праходзіла ў межах агульнай характарыстыкі комплексу жаночага касцюма [12]. Таму на сённяшні момант яно патрабуе дэталёвага агляду, навуковай характарыстыкі і сістэматызацыі.

Прадметаў адзення беларускіх сялянак канца XIX — пачатку XX ст. на 01.04.2020 г. у фондах НПГКМЗ налічваецца 20 адзінак захоўвання (прадметаў асноўнага фонду — 10 адз., навукова-дапаможнага — 10 адз.), сярод якіх вылучаюцца як арыгінальныя прадметы, датаваныя ў асноўным канцом XIX — пачаткам XX ст. (6 адз.), так і рэканструкцыі (14 адз.).

Пачатак дадзенаму комплексу адзення быў пакладзены вельмі даўно, калі пачынала сваё фарміраванне калекцыя Полацкага краязнаўчага музея (Акт № 004 ад 07.07.1959 г.) [4, с. 67—76]. Такім чынам, комплекс адзення беларускіх сялянак канца XIX — пачатку XX ст. у фондах НПГКМЗ складаўся на працягу 61 года. Сярод прычын, што негатыўна паўплывалі на працэс фарміравання калекцыі, прысутнічаюць як аб’ектыўныя, так і суб’ектыўныя. Сярод першых вылучаюцца тыя, што гістарычна склаліся ў асобных рэгіёнах Беларусі.

Асаблівасцямі эканамічнага развіцця этнаграфічнага рэгіёна Падзвінне з’яўляюцца сацыяльныя працэсы, звязаныя з адыходніцтвам — наймам на працу па-за межамі свайго месцажыхарства; менавіта яны сталі тымі фактарамі, што моцна паўплывалі на традыцыйны побыт жыхароў гэтай тэрыторыі, у тым ліку і на іх адзенне. Акрамя адыходніцтва, прычынай хуткіх сацыяльна-эканамічных перамен у дадзеным рэгіёне было развіццё прамысловасці і гандлю. Галоўнай даходнай справай Віцебскай губерні было вырошчванне лёну, канапель, гандль лесам. Наяўнасць грошай, атрыманых за рэалізаваны тавар або за працу па найме, давала магчымасць жыхарам Віцебскай губерні набываць для пашыву адзення тканіны фабрычнага вырабу, а таксама асобныя элементы касцюма фабычнай вытворчасці (спадніцы, хусткі і г. д.). Таму традыцыйны касцюм на гэтай тэрыторыі пачаў выходзіць з ужытку значна раней, чым у іншых месцах Беларусі — яшчэ ў другой палове XIX ст., што значна абцяжарвае папаўненне разглядаемай калекцыі [3, с. 35].

*Бараненка Т. В.* DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-34-40

Да суб’ектыўнай прычыны, што негатыўна паўлывала на фарміраванне разглядаемага комплексу адзення, адносіцца наступнае: за апошняе дзесяцігоддзе навуковымі супрацоўнікамі музея-запаведніка не была арганізавана ніводная этнаграфічная экспедыцыя. Сярод шляхоў папаўнення фондаў адзінкамі адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. вылучаецца перадача і закупка ў прыватных асоб ці дзяржаўных устаноў.

Тэрытарыяльная лакалізацыя адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. з фондаў НПГКМЗ выглядае наступным чынам: з тэрыторыі Віцебскай губерні — 17 адз. (3 — арыгіналы, 15 — рэканструкцыі), Мінскай губерні — 2 адз. (арыгіналы). Жаночае сялянскае адзенне Віленскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў у калекцыі не прадстаўлена. Згодна з планамі навуковага камплектавання фондаў НПГКМЗ, камплектаванне комплексу адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. ажыццяўляецца з тэрыторыі такога гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна, як Беларускае Падзвінне∗, які ў канцы XIX — пачатку XX ст. такую адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінку Расійскай імперыі, як Гродзенская губерня не уключаў. Разам з гэтым, Віленская і Магілёўская губерні ўваходзілі ў склад разглядаемага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна толькі часткова (пераважна паўночная частка Віленскай і Магілёўскай губерняў). Таксама трэба адзначыць, што 1 адзінка (арыгінал) не мае дакладнай лакалізацыі і вызначаецца толькі фармуліроўкай месца як «Расійская імперыя».

Згодна з класіфікацыяй, што распрацавана даследчыкамі В. М. Барвенавай і Л. В. Ракавай, разглядаемае адзенне можна падзяліць па прынцыпе асноўнага «мацавання» (нашэння) на плечавое і паяснае [1]. Так, да плечавога адзення адносяцца жаночыя кашулі ў колькасці 8 адзінак (4 — арыгіналы, 4 — рэканструкцыі).

Яшчэ этнограф М. Нікіфароўскі ў канцы XIX ст. паведамляе нам аб крої жаночых кашуль Віцебскай губерні: «Для будничной надобности женская рубашка шьётся из довольно грубого, хотя и ровного холста. Она бывает „бизковнерной“, сбирающейся на шее при помощи снурка <…> с узким воротником, который правильнее назвать обшивкой <…> рукава имеют короткие обшлага, застёгивающиеся на пуговицу» [10, с. 115]. Даследчык П. В. Шэйн згадвае: «Рубашка имеет палики в виде наплечных нашивок крамной (лавочной) материи, или холщёвой цветной домотканки» [7, с. 48].

Прыведзеныя вышэй зафіксаваныя ў канцы XIX — пачатку XX ст. пісьмовыя звесткі даследчыкаў беларускай культуры пацвярджаюцца асобнымі адзінкамі калекцыі з фондаў НПГКМЗ. Кашулі з былой тэрыторыі Віцебскай губерні (2 — арыгіналы, 4 — рэканструкцыі) выкананы пераважна з даматканай тканіны белага колеру, у крої маюць плечавыя ўстаўкі — «полікі», доўгія рукавы з манжэтамі, каўнер-стойку і прамы разрэз на полачцы (*мал. 1*).



Малюнак 1. — Кашуля з «полікамі».
Расійская імперыя, Віцебская губ., Полацкі пав.,
в. Сосна. 1880—1885 гг.

∗ Планы навуковага камплектавання фондаў на 2011—2015 гг. і 2016—2020 гг. захоўваюцца ў НПГКМЗ.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-34-40

У больш познім варыянце (пачатак XX ст.) кашулі жанчын Віцебскай губерні маюць замест «полікаў» прышыўную какетку — «гестку», якая з'явілася ў крої кашуль пад уплывам гарадской моды [11, с. 52]. У такім выпадку асноўная частка кашулі пры сшыванні з какеткай уверсе была прысабрана ў складкі. Кашуля з фондаў НПГКМЗ (КП5-2274) мае разнавіднасць какеткі, якую ў народзе раней празвалі «галаплечка». Такую какетку выкройвалі з чатырох прамавугольных частак: дзвюх папярэчных і дзвюх вертыкальных, якія сшывалі ў прамавугольную рамку. Ворат не прадугледжваў прышыванне каўняра і адкрываў шыю, таму адсюль і паходзіць назва [5, с. 36]. Кашуля з падобнай какеткай мае спераду празрэз на грудзях і зашпільку на гузік (*мал. 2*).

Сярод адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. у фондах НПГКМЗ прысутнічаюць дзве кашулі, што лакалізаваны тэрыторыяй былой Мінскай губерні (КП12-7046; КП12-7195). Кашулі прамога крою, доўгія, з адкладным каўняром (КП12-7195 мае каўнер у выглядзе пышных фальбонаў), з V-падобнай прарэхай на грудзях, апрацаванай нешырокай планкай (*мал. 3*).



Малюнак 2. — Кашуля на «гестцы» («галаплечка»).
Расійская імперыя, Віцебская губ., 1850—1900 гг.



Малюнак 3. — Кашуля з каўнерам у выглядзе фальбонаў.
Расійская імперыя, Мінская губ., в. Зеляночча,
1850—1917 гг.

Усе кашулі з калекцыі ўпрыгожаны вышыўкай расліна-геаметрычнага характару ў традыцыйнай чырвона-чорнай гаме. Вышыўка на вырабах размешчана на рукавах (плечы, манжэты), какетках, на каўняры. Сярод тэхнік, у якіх выкананы арнамент, можна вылучыць наступныя: вышыўка крыжыкам, вышыўка «у працяг», простыя ўпрыгожваючыя швы (шво «назад іголку», сцяблістае шво). Таксама сярод упрыгажэння кашуль з калекцыі вылучаецца аздабленне вязанымі кручком карункамі з ніток бела-чырвонага колеру па каўняры (КП12-7046) і злучальным пяцельным швом [5, с. 120] (КП12-7195).

Сярод плечавога адзення сялянак беларускіх губерняў, акрамя кашуль, у фондах музея-запаведніка прысутнічае рэканструкцыя сарафана канца XIX — пачатку XX ст. (КДФ5-4355/1). Сарафан касаклінны, выкананы з фабрычнай тканіны сіняга колеру. Мае станік з доўгімі лямкамі, якія сыходзяцца на спіне. Упрыгожаны атласнай стужкай чырвонага колеру па падоле, праймах, лямках. Спераду, пасярэдзіне, мае шво, якое аздоблена дэкаратыўнай тасьмой. Сарафан выкананы майстрыхамі Лепельскага дома рамёстваў «Скарбонка» ў 2005 г. і разам з кашуляй (КДФ5-4355/2) з'яўляецца рэканструкцыяй Расонскага строю маладой жанчыны канца XIX — пачатку XX ст., зробленай на аснове традыцыйнага строю народнага адзення беларусаў канца XIX — пачатку XX ст. [9].

Паясное адзенне беларускіх сялянак канца XIX — пачатку XX ст. у залежнасці ад крою і якасці тканін, якія ішлі на яго пашыў, мела шмат назваў: андарак, дрыліх, спадніца, саян, саматканка, сіняк, бяляк, палатнянік і г. д. [11, с. 126]. У фондах НПГКМЗ яно прадстаўлена наступнымі відамі: спадніца (1 адз. — рэканструкцыя), андарак (3 адз.: 1 — арыгінал, 2 — рэканструкцыя), саян (2 адз. — рэканструкцыі), фартух (5 адз.: 1 — арыгінал, 4 — рэканструкцыі).

Спадніца (КДФ4-2573/4) уяўляе сабой рэканструкцыю паяснога адзення жыхаркі Паазер'я, зробленую з паўшарсцяной тканіны ў клетку сіне-зялёна-бела-чорнага і чырвонага колеру. Па падоле выраб упрыгожаны пяцісантыметровай стужкай тканіны чорнага колеру. Спадніца зроблена майстрам НПГП «Скарбніца» Н. А. Мядзвецкай (г. Мінск, Беларусь) у 1998 г. і экспануецца ў Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я (філіял НПГКМЗ).

У XIX — пачатку XX ст. у сялянскім асяродку паўсюдна была распаўсюджана спадніца, якая мела назву «андарак». Асобныя даследчыкі звязваюць яе паходжанне з нямецкім словам «Unteroch», якое абазначала ніжнюю спадніцу. На беларускіх землях у феадальны час андаракі былі шырока вядомым паясным адзеннем жанчын прывілеяванага саслоўя [1, с. 188].

Два андаракі (КП17-18658 і КДФ?-10563) уяўляюць сабой рэканструкцыі жаночага паяснога адзення канца XIX — пачатку XX ст. Так, андарак (КДФ?-10563) з'яўляецца рэканструкцыяй паяснога адзення жыхаркі Полацкага павета Віцебскай губерні канца XIX ст. (арыгінал захоўваецца ў фондах Расійскага этнаграфічнага музея (г. Санкт-Пецярбург, Расія) у калекцыі № 3026, што сабрана А. К. Сержпутоўскім у 1914 г. на тэрыторыі Віцебскай губерні) [8, с. 53, 84]. Рэканструкцыя андарака выканана майстрам Н. А. Глушко (г. Мінск, Беларусь) у 2019 г.* з даматканай тканіны ў рознакаляровую клетку, мае пояс.

Трэці андарак (КП12-7048) пашыты з даматканай ваўнянай тканіны у дробную клетку зялёнага і ружовага колеру. На поясе выраб сабраны ў гафрыраваныя складкі. Андарак выкананы Н. Д. Салаў'ян (1891—1973 гг. ж.), датуецца 1900—1920 гг.; у фондах музея-запаведніка месца вырабу і бытавання лакалізуецца фармуліроўкай «Расійская імперыя» (*мал. 4*). Разам з гэтым, згодна са шматлікімі даследваннямі традыцыйнага касцюма, андаракі з даматканай ваўнянай тканіны ў клетку са складкамі на поясе былі даволі распаўсюджаным паясным адзеннем беларускіх сялянак у разглядаемы перыяд [1, с. 188—191; 6, с. 30—33]. Таму тэрытарыяльна андарак (КП12-7048) з фондаў НПГКМЗ можа паходзіць с тэрыторый былых беларускіх губерняў Расійскай імперыі.



Малюнак 4. — Андарак. Расійская імперыя, 1900—1920 гг.

* Андарак выкананы і набыты пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза ў рамках праекта ENI-LBB-1-216 «Изучение и сохранение традиционных ремесленных навыков жителей долины Двины / Даугавы и передача их будущему поколению».

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-34-40

Тэрмін «саян» панаваў у XIX — пачатку XX ст. у паўночна-ўсходніх раёнах Віцебшчыны. Так называлі спадніцы з куплёнага і даматканага сукна. Дадзены від паяснога адзення ў калекцыі прадстаўлены дзвюма адзінкамі.

Першы саян (КП17-18660) уяўляе сабой спадніцу, сшытую з 6-ці полак даматканага палатна шэрага колеру. Па нізе яго ўпрыгожваюць папярочныя палосы баваўнянай тканіны чорнага колеру. З левага боку мае матузы. Выраб падшыты тканінай шэрага колеру. Выкананы саян у 2001 г. майстрам клуба народных майстроў «Скарбонка» Лепельскага дома рамёстваў Д. М. Семановіч як рэканструкцыя адзення беларусаў канца XIX — пачатку XX ст. [9, с. 2, 27, 29].

На сумежнай тэрыторыі з Магілёўскай і Смаленскай губернямі ў жаночым адзенні быў распаўсюджаны саян у выглядзе спадніцы з прышыўным ліфам-кабатам на высокай лініі таліі. Разам з саянам з ліфам бытаваў і саян «на вілачцы» (сарафан), які быў запазычаны з гарадской моды і ў пачатку XX ст. стаў папулярнай вопраткай сярод моладзі на сумежжы са Смаленскай і Пскоўскай губернямі [11, с. 220].

Саян «на вілачцы» з фондаў НПГКМЗ (КДФ?-10560) з'яўляецца рэканструкцыяй адзення жыхаркі Веліжкага павета Віцебскай губерні пачатку XX ст. (па матэрыялах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея) і ўяўляе сабой спадніцу з прышыўным ліфам, выканананую з тканіны сіняга колеру, упрыгожанай раслінным арнаментам у тэхніцы набойкі. Рэканструкцыя саяна выканана майстрам Н. А. Глушко (г. Мінск, Беларусь) у 2019 г.*

Паверх спадніц, андаракаў і саянаў сялянкі беларускіх губерняў у канцы XIX — пачатку XX ст. павязвалі фартух. На кожны дзень насілі фартухі палатняныя, з даматканіны, на святы — з куплёнага або з кужэльнага хатняга палатна. Фартухі насілі і дзяўчаты, і жанчыны. Большасць этнаграфічных запісаў сведчаць аб тым, што дзяўчына пачынала насіць фартух з дасягнення паўналецця або адразу з вяселля. Побач з утылітарнай функцыяй існавала і сімвалічная, што змяшчала ідэю жанчыны-маці, ідэю нараджэння. Як сведчаць этнаграфічныя дадзеныя, прыведзеныя даследчыцай беларускай культуры Т. Валодзінай, «у фартух кідалі чарапкі, каб жанчына магла зацяжарыць, бясплодныя жанчыны мусілі прайсці на каленях ад царквы да Ушэсценскай крыніцы на Ушаччыне і павесіць над святой вадой свой фартух» [2, с. 197].

Шылі фартухі з адной, дзвюх, трох полак палатна, збіраючы ў дробную зборку або складкі на паясніцы. Вельмі часта фартухі «вышывалі» крыжыкам ці гладдзю ўнізе 1—2 вузкімі палоскамі геаметрычнага ці расліннага арнаменту. Пераважную большасць іх знізу падшывалі вязанымі кручком карункамі [1, с. 197].

Фартухі з фондаў НПГКМЗ прадстаўлены 5 адзінкамі (1 — арыгінал, 4 — рэканструкцыі). Сярод фартухоў калекцыі асаблівую цікавасць уяўляе арыгінальны фартух (КП5-2346), што датуецца 1880—1917 гг. і паходзіць з тэрыторыі былой Віцебскай губерні Расійскай імперыі. Ён шэрага колеру і пашыты з дзвюх полак. На поясе мае ў кулісцы вяроўку. Унізе выраб аздоблены вытканымі 7-мю бардзюрамі геаметрычнага арнаменту ў бела-чырвонай гаме і белымі зубчастымі карункамі (сеткавы ўзор), што абвязаны чырвонай ніткай у тэхніцы вязання кручком (*мал. 5*).

Астатнія чатыры фартухі калекцыі — гэта рэканструкцыі паяснога адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. Так, у 2019 г. у фонды НПГКМЗ паступіў фартух (КДФ?-10564), што з'яўляецца рэканструкцыяй часткі адзення жыхаркі Полацкага павета Віцебскай губерні канца XIX ст., у аснову выканання якой былі пакладзены матэрыялы Расійскага этнаграфічнага музея (г. Санкт-Пецярбург, Расія). Рэканструкцыя фартуха выканана майстрам Н. А. Глушко (г. Мінск, Беларусь).**

Такім чынам, фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка захоўваюць калекцыю беларускага жаночага адзення канца XIX — пачатку XX ст. На сённяшні момант яна складаецца з арыгінальных прадметаў, датуемых пераважна канцом XIX — пачаткам XX ст., а таксама добра выкананых рэканструкцый. Трэба адзначыць, што доля арыгінальных прадметаў складае толькі 30% (6 адз.). Большая частка калекцыі прадстаўлена рэканструкцыямі — 70% (14 адз.). Таму з гістарычнага пункту гледжання калекцыя адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. у фондах НПГКМЗ на сённяшні момант не можа быць выкарыстана даследчыкамі традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларускага народа ў поўным аб’ёме.

---

* Саян выкананы і набыты пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза ў рамках праекта ENI-LBB-1-216 «Изучение и сохранение традиционных ремесленных навыков жителей долины Двины / Даугавы и передача их будущему поколению».

** Фартух выкананы і набыты пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза ў рамках праекта ENI-LBB-1-216 «Изучение и сохранение традиционных ремесленных навыков жителей долины Двины / Даугавы и передача их будущему поколению».

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-34-40



Малюнак 5. — Фартух. Расійская імперыя, Віцебская губ., 1880—1917 гг.

Бачыцца мэтазгодным і надалей збіраць і папаўняць дадзеную калекцыю прадметамі жаночага традыцыйнага адзення канца XIX — пачатку XX ст. Дзеля дасягнення пастаўленай мэты неабходна выкананне наступных задач:

— папаўняць фонды музея-запаведніка арыгінальнымі прадметамі адзення канца XIX — пачатку XX ст.;

— у працэсе камплектавання аддаваць перавагу арыгінальным прадметам адзення беларускіх сялянак канца XIX — пачатку XX ст., змяншаючы такім чынам колькасць рэканструкцый у калекцыі;

— сярод шляхоў папаўнення фондаў адзінкамі адзення сялянак беларускіх губерняў канца XIX — пачатку XX ст. асаблівую ўвагу навуковым супрацоўнікам музея-запаведніка звярнуць на наладжванне і ажыццяўленне штогадовых этнаграфічных экспедыцый;

— экспедыцыйную дзейнасць праводзіць на тэрыторыі такога гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна, як Беларускае Падзвінне (адзначым, што паўночная частка Віленскай і Магілёўскай губерняў уваходзіла ў склад дадзенага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна);

— асаблівую ўвагу навуковым супрацоўнікам музея-запаведніка звярнуць на пошук сярод рэчавых, пісьмовых крыніц сведчанняў вырабу, бытавання, апісання Полацкага жаночага строя канца XIX — пачатку XX ст. для яго аднаўлення і далейшага экпанавання ў Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Бялявіна, В. М. Жаночы касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007. — 351 с.
2. Валодзіна, Т. Фартух / Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мінск : Беларусь, 2011. — С. 491—492.
3. Віннікава, М. М. Традыцыйны беларускі касцюм = Традиционный белорусский костюм = Traditional belarussian costume : альбом / Марыя Віннікава, Паліна Богдан. — Мінск : Беларуская навука, 2016. — 302 с.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-34-40

4. Джумантаева, Т. А. Полацкаму музею-запаведніку — 50 / Т. А. Джумантаева, Т. Д. Рудава // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Полацк, 1—2 лістапада 2017 г.) / уклад. Т. У. Явіч. — Полацк : Полацкае кніжнае выдавецтва, 2019. — С. 67—76.

5. Лобачевская, О. А. Белорусский народный костюм : крой, вышивка и декоративные швы / О. А. Лобачевская, З. И. Зимина. — Минск : Беларуская навука, 2009. — 279 с.

6. Маленко, Л. И. Белорусский костюм XIX—XX вв. / Л. И. Маленко. — Минск: Бел. наука, 2006. — 142 с.

7. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, собранные и приведённые в порядок П. В. Шейном [Текст]: в 3 т. / сост. П. В. Шейн; Императорская Академия Наук, отделение русского языка и словесности. — СПБ: Типография Императорской Академии Наук, 1902. — Т. 3. — IV, 535 с. — (Сборник Отделения русского языка и словесности Императорской Академии Наук; том LXXII. № 4).

8. Материалы по этнографии белорусов в собрании Российского этнографического музея. Предметно-тематический каталог-указатель коллекций / составитель О. В. Лысенко. — Санкт-Петербург, 1993. — 108 с.

9. Матэрыялы да рэканструкцыі варыянтаў народных строяў. Мастацка-тэхналагічны аналіз экспанатаў, рэканструяваных на аснове традыцыйных строяў народнага адзення беларусаў канца XIX — пачатку XX ст. / Дом рамёстваў. Клуб народных майстроў «Скарбонка». — Лепель, 2001. — 30 с.

10. Никифоровский, Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности : этнографические данные / Н. Я. Никифоровский. — Витебск : Губернская Типография, 1895. — VIII, 552, CLIV с.

11. Традыцыйнае адзенне Віцебшчыны / укладальнікі Людміла Вакар, Ніна Бабровіч. — Мінск : Белстан, 2017. — 372 с.

12. Філатава, Н. В. Асноўныя комплексы мужчынскага і жаночага адзення Падзвіння і іх лакальныя асаблівасці ў к. 19 — пач. 20 стст. / Н. В. Філатава // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 1998 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. — Полацк : ПГКМЗ, 1999. — С. 131—136.

## ОДЕЖДА БЕЛОРУССКИХ КРЕСТЬЯНОК КОНЦА XIX — НАЧАЛА XX в. В МУЗЕЙНОМ СОБРАНИИ НАЦИОНАЛЬНОГО ПОЛОЦКОГО ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО МУЗЕЯ-ЗАПОВЕДНИКА

*Бараненко Татьяна Валерьевна,*
*магистр исторических наук,*
*ведущий научный сотрудник Музея традиционного ручного ткачества Поозерья — филиала НПИКМЗ*

*Статья посвящена комплексу одежды белорусских крестьянок конца XIX — начала XX в., хранящегося в музейном собрании Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника (далее — НПИКМЗ). Автор впервые даёт научное описание и систематизацию одежды белорусских крестьянок конца XIX — начала XX в. из коллекции НПИКМЗ. Обращается внимание на трудности при формировании коллекции и предлагаются пути их преодоления.*

***Ключевые слова**: одежда, белорусские крестьянки, традиционная культура, Российская империя, музейная коллекция.*